Секцыя 1

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***М. А. Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

## НОРАВЫ І ЗАБАВЫ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ – АДЛЮСТРАВАННЕ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ ТАГАЧАСНАГА ГРАМАДСТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Назапашаныя веды, здароўе і вольны час з'яўляюцца важнейшым багаццем кожнага чалавека, уменне карыстацца якім характарызуе яго як сацыяльную асобу. Рацыянальная арганізацыя атрымання ведаў, аховы здароўя і баўлення вольнага часу з'яўляецца і адпаведным кірункам дзяржаўнай палітыкі, і адлюстраваннем сацыякультурнага ўзроўню грамадства. Сувязь канкрэтнай сацыякультурнай сітуацыі і арганізацыйных прыёмаў і форм баўлення вольнага часу мае характар узаемаўплыву і ўзаемадзеяння.

У назве артыкула дакладна не вызначаны храналагічны перыяд. Аднак, з аднаго боку, дэфініцыя «беларуская шляхта» дастаткова выразна яго акрэслівае, таму што шляхецкае саслоўе, як найбольш палітычна ўплывовае ў Вялікім Княстве Літоўскім, аформілася на працягу XVI–XVIII стст. Звернем увагу і на той відавочны факт, што яно не было аднародным, а ўяўляла складаны сацыяльны арганізм, на вяршыні якога знаходзіліся паны (ці магнаты), самая ўплывовая група з 40 ро-

даў, унізе – збяднелая, ці дробная (шарачковая, засцянковая), шляхта, а між імі сярэдняя, ці заможная, шляхта. Асаблівасцю тагачаснага беларускага грамадства з'яўлялася значная колькасць шляхты, каля 10–12 % ад усяго насельніцтва.

З другога боку, храналагічныя рамкі абумоўлены наяўнымі крыніцамі і літаратурай па названай тэме. Такі дасканалы знаўца і даследчык шляхецкай культуры, як А. Мальдзіс, адзначае, што «твораў беларускай мастацкай літаратуры ад XVIII–XIX стагоддзяў захавалася да крыўднага мала», але ў той жа час «славянская мемуарыстыка дае нам багаты матэрыял для характарыстыкі быту і нораваў тагачаснай Беларусі» [2, с. 8, 12]. Гэтыя крыніцы А. Мальдзіс актыўна выкарыстоўваў пры распрацоўцы тэмы аб жыцці нашых продкаў. Апошнім часам выйшаў у свет пераклад з польскай мовы рамана-дзённіка Саламеі Пільштыновай, па-беларуску загучалі дзённікі Юльяна Урсына Нямцэвіча і інш. Адзначым таксама, што ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў абаронены кандыдацкія дысертацыі Ю. Д. Пярсідскай, А. Я. Корсакавай, С. А. Пацыенка, у якіх у пэўнай ступені закранаецца пазначаная намі тэма. Вольны час з'яўляецца ўпершыню ў першабытным грамадстве. Ён трацішча тагачасным насельніцтвам на стварэнне мастацкіх вобразаў і вырабаў. Узровень эканамічнага развіцця ў перыяд Антычнасці дазволіў выдзяліцца значнай групе людзей, незалежных ад заняткаў гандлем, рамяством, сельскай гаспадаркай і здольных прысвяціць свой вольны час філасофскім роздумам, заняткам навукай, літаратурай. У часы Сярэднявечча ўмяшальніцтва царквы ва ўсе сферы сацыякультурнага жыцця вызначала своеасаблівасць зместу і форм арганізацыі вольнага часу. Сацыякультурнае жыццё суправаджалася святамі, з аднаго боку, народнымі, якія бралі свой пачатак у язычніцтве, з другога – царкоўнымі. У сярэднявечным беларускім грамадстве вольны час таксама знаходзіўся пад прыкметным уплывам царквы. У гарадах адбываліся масавыя мерапрыемствы: на святочна аформленых вуліцах шэсці духавенства, цэхавых карпарацый рамеснікаў з уласнымі эмблемамі і інструментамі ў суправаджэнні музыкі, гарматных салютаў. Там, дзе дамінавала праваслаўная царква і захоўваліся праваслаўныя традыцыі, калектыўныя мерапрыемствы ператвараліся ў канцэрты з выкананнем харавых, у тым ліку партэсных, музычных твораў, у гарадах, дзе існавалі езуіцкія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калегіумы, агульнагарадскія мерапрыемствы праводзіліся ў форме грандыёзных тэатралізаваных прадстаўленняў [3, с. 15, 16].

Адзначым, што важнейшы ўплыў на баўленне шляхтай вольнага часу аказвала сістэма так званых залатых шляхецкіх вольнасцей, якая заканадаўча была аформлена на працягу XVI–XVIII стст. Яна ўключала шматлікія правы шляхты, і сярод іншых права ўсёй шляхты на выбары караля (прычым сярод шляхты існавала ўпэўненасць у праве кожнага з іх быць абраным на гэтую пасаду вялікага князя). На выпадак незадаволенасці палітычнай лініяй кіраўніка дзяржавы шляхта дабілася права на арганізацыю ваенна-палітычных саюзаў – канфедэрацый і ўзброеных паўстанняў – рокашаў і інш. Такая палітычная свабода шляхецкага саслоўя вызначала ўяўленне шляхты і аб змесце свайго вольнага часу.

Шляхецкая культура Вялікага Княства Літоўскага фарміравалася, у пэўнай ступені, на традыцыях еўрапейскай рыцарскай культуры, галоўным зместам якой былі паляванне і ваенныя практыкаванні. Але шляхецкія станы Вялікага Княства Літоўскага ўнеслі ў традыцыю свае ўяўленні аб магчымасцях баўлення вольнага часу. Да названых вышэй можна дадаць працяглыя баляванні, вечарынкі, маскарады, святкаванні юбілеяў, імянін, рэлігійных свят і інш. Былі вельмі распаўсюджаны гульні (у тым ліку і азартныя): у косці, фанты, більярд, карты, у шашкі і шахматы. Радзівілы, напрыклад, прыдумалі «гульню ў вёску», пабудаваўшы непадалёк ад Нясвіжа ў паркава-палацавым комплексе Альба ідылічную вёску на 180 хатак. Князь і яго госціператвараліся на некаторы час у «сялян», апрануўшы халопскія бутафорскія касцюмы, працавалі ў мініяцюрных агародзіках і ў садочках, даглядалі хатнюю птушку і жывёлу… Мужчыны пасвілі бараноў, шыі якіх павязваліся стужкамі, і падыгрывалі сабе на флейце ці гітары [4, с. 70]. У Альбе шляхецкіх дзяцей вучылі на матросаў, і кульмінацыяй навучання быў «штурм Гібралтара», у якім удзельнічала да 30 караблёў.

Прыкладам для пераймання ў адносінах да баўлення вольнага часу для шляхты былі магнаты, асабліва Радзівілы, і найперш – іх забавы. У другой палове XVIII ст. самай уплывовай асобай сярод шляхты ВКЛ быў Караль Станіслаў (Пане Каханку). Выкарыстаем некалькі прыкладаў з кнігі А. Мальдзіса аб арганізацыі масавых свят пад яго патранажам. Дасле-

чык піша, што вялікія багацці дазвалялі Пане Каханку весці разгульнае жыццё: калі вяселле – то тыдзень, калі пахаванне – то тры дні бесперапыннага п’янства, гучна адзначаліся абрадавыя святы. Напрыклад, на Каляды 1780 г. у Нясвіж было дастаўлена 1500 бутэлек шампанскага, 300 – рэйнскага, 3 бочкі англійскага піва, 10 бочак пораху для феерверкаў, 15 бочак вустрыц і г. д. Імяніны таксама адзначаліся пышна. Напрыклад, у 1783 г. урачыстасці пачаліся залпамі з сотні гармат. Затым экскорт скіраваў у фарны касцёл. Наперадзе ехаў атрад кавалерыі. За ім вялі дванаццаць коней, збруя якіх ззяла жэмчугам, рубінамі… Далей у дванаццаці парадных карэтах, запрэжаных шасцёркамі, ехалі члены сям’і. Наступныя пяцьдзесят карэт былі прызначаны для гасцей. За абедзенымі сталамі ў той дзень сядзела 160 чалавек. Пасля абеду паказалі оперу. Урачыстасці завяршыліся вячэрай, феерверкамі і балем [2, с. 168–169].

Караль Радзівіл, як найзаможнейшы магнат Вялікага Княства Літоўскага, імкнуўся засланіць нават каралеўскі двор. У 1789 г. ён «ад імя Літвы» даваў у Варшаве «прыём для Кароны», на які было запрошана больш чатырох тысяч чалавек, якія падымаліся па лесвіцы, пакрытай пунсовым сукном, карысталіся залатымі сталовымі прыборамі, прыслугоўвалі гасцям прыдворныя, апранутыя ў жоўтыя атласныя жупаны, падпаясаныя аднолькавымі слуцкімі паясамі, і г. д. [2, с. 170].

Ва ўспамінах Ю. Урсына Нямцэвіча цікава апісваюцца ўрачыстасці з нагоды шлюбу сястры Пане Каханку, Тэафілі, з князем Масальскім. Аўтар успамінаў лічыць, што гэта было апошняе такое вяселле ў краі і што другой такой урачыстасці наступныя пакаленні ўжо не ведалі [1, с. 130]. Вяселле адбывалася ў Белай – рэзідэнцыі Радзівілаў непадалёк ад Любліна. Паводле Ю. Урсына Нямцэвіча, з’езд знаці Вялікага Княства Літоўскага быў празмерны, «прыехалі на вяселле са сваімі дварамі гетман М. К. Агіньскі, князь А. Чартарыйскі, мноства іншых знатных гасцей. Неслі варту і ўдзельнічалі ў парадах каля 3000 салдат «выбранецкай пяхоты» – прыватнага войска Радзівілаў. Увесь час вясельнага абраду войска салютавала. Пасля вянчання пачаліся ўрачыстыя абеды, якія перамяжоўваліся танцамі, канцэртамі. Як апісвае адно з такіх музычных мерапрыемстваў Ю. Нямцэвіч, канцэрт наладзілі М. К. Агіньскі і К. С. Радзівіл, першыя спадары, першыя ўладары ў краі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхваляючыся, здзіўлялі нямала: Агіньскі ведаў толк у музыцы, нават быў кампазітарам, іграў на кларнэце гладка і прыгожа, але на што было падобна «квічанне» князя Радзівіла?.. Выказаць словамі таго нельга, а ні ўздрыгвання слухачоў, ні нецярплівасці гетмана, калі сярод яго салодкіх тонаў Радзівіл знянацку піскнуў сваім лякаючым выдыхам [1, с. 127, 129].

Важнае значэнне для падтрымкі прэстыжу роду Радзівілаў, памяці пра іх уклад у паспяховае развіццё гістарычных падзей, значных не толькі для Рэчы Паспалітай, але і многіх еўрапейскіх краін, мела святкаванне адпаведных знамянальных дат. Напрыклад, у 1783 г. у Нясвіжы ўрачыста адзначалася 100-годдзе перамогі пад Венай польска-аўстрыйска-нямецкага войска на чале з каралём Рэчы Паспалітай і вялікім князем літоўскім Янам Сабескім над войскам Асманскай імперыі на чале з вялікім візірам Кара Мустафой. Справа яшчэ і ў тым, што родная сястра Яна Сабескага, Кацярына, прыходзілася прабабуляй К. С. Радзівілу. Князь наладзіў вельмі ўрачыстае святкаванне юбілею, падчас якога на агляд гасцей былі выстаўлены багатыя трафеі Яна Сабескага. Сярод іх – турэцкія харугвы, зброя, вялікі шацёр, прадметы побыту. Дэманстраваліся асабістыя рэчы караля [4, с. 63].

Безумоўна, сярэдняя і дробная шляхта не магла ладзіць увесяленні, падобныя да магнацкіх. Аднак на сваім узроўні яна шмат што пераймала ад багатых паноў. Зручным месцам для дэманстрацыі шляхецкага гонару аказаліся агульныя і павятовыя сеймы. Мемуарысты сведчаць, што ехалі туды як на свята – разам са слугамі, «метрэсамі», запасамі правіянту. У прамежках паміж пасяджэннямі наладжваліся тэатральныя прадстаўленні, вячэры, балі. Віно лілося ракою, пілі нават на пасяджэннях [2, с. 236–237]. На сеймах і сейміках часта ўзнікалі скандалы, бойкі, нават з чалавечымі ахвярамі. Аб гэтым пісаў у сваіх «Мемуарах» будучы кароль і вялікі князь Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, калі ўспамінаў аб удзеле ў сваіх першых выбарах у якасці пасла на сейм ад Брэсцкага ваяводства. Падчас выбараў яму было 20 год, і малады чалавек, еўрапейскай выхаванасці і адукаванасці, быў вымушаны весці бясконцыя перамовы «з гэтым зборышчам», як ён называў разбэшчаны сеймік, хваліць бязглуздзіцы, захапляцца дрэннымі жарцікамі і г. д. Але самая нечаканая імпрэза чакала яго пасля перамогі на выбарах. Старшыня выбарчай кампаніі пан Глінка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

запрасіў С. А. Панятоўскага адсвяткаваць гэтую падзею пасяброўску. Яны паехалі за горад да брэсцкага старосты, пажылога, у добрых гадах ужо, хворага на падагру, які меў маладую жонку, што была «аб’ектам самых чуллівых пажаданняў» старшыні выбарчага сходу. Як самы цяжкі для яго дзень успамінаў будучы кароль наступныя падзеі: пан Глінка прапанаваў арганізаваць баль, на якім у якасці дам павінны былі выступаць жонка старосты і дачка старшыні. «Месцам для танцаў служыў ганак з гнілаватай падлогай. Староста рассеўся ў адным куце, другі заняла адзіная расстроеная скрыпка, а Глінка і я [С. А. Панятоўскі], служачы на змену гэтым дамам, танцавалі ад шостай пасля абеду да шостай раніцы. Пры кожным танцы Глінка сумленна выхіляў келіх, страсаючы апошнюю кроплю на пазногаць, а стары староста верна яму адказваў» [2, с. 242].

Як своеасаблівую форму шляхецкіх забаў, можна разглядаць гіпертрафіраваны культ госця, якога, у некаторых выпадках, нават сілай прымушалі завітаць у дом, а потым і затрымаць на некалькі дзён. Ад Каляд да Вялікага посту, у так званы карнавал, госці паводзілі сябе надзвычай нахабна. Перад Запустамі шляхта ладзіла масленічны поезд – куліг. Апісанне гэтай забавы, узятае ў мемуарыста Кітовіча, прыводзіцца А. Мальдзісам: «… Два або тры суседы [часцей за ўсё «ніжэйшай заможнасці»] дамаўляліся паміж сабой, бралі з сабой жонак, дачок, сыноў, слуг… напакаваўшыся ў санкі, калі ж саннай дарогі не было – у каляскі, карэты, вазочкі, а таксама на ездавых коней, як хто мог кіраваліся да бліжэйшага суседа, які ані прасіў іх, ані папярэджваўся, бо мог скрыцца ці з’ехаць з хаты. Там, заставўшы яго знячэўку, загадвалі даваць ім есці, піць, коням і людзям, без ніякай цырымоніі… Да таго часу ў яго дэбашырылі, пакуль не апаражнілі ў яго склеп, камору, свіран. Калі ж ужо выелі і выпілі ўсё, што было, бралі таго небараку з сабой з цэлай яго сям’ёй і цягнуліся да іншага суседа, якому рабілі такое ж спусташэнне, затым ехалі далей, пакуль не даходзіла чарга да тых, хто пачаў куліг» [2, с. 285].

Прыклады падобнага баўлення вольнага часу шляхецкім саслоўем ахопліваюць значную масу шляхты, якая даказвала сваю годнасць на шматлікіх увесяленнях, паляваннях, кулігах і г. д. пасродкам дэманстрацыі здольнасці многа выпіць, умення падладзіцца пад жаданні больш уплывовых асоб, дэман-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страцыі адданасці іх інтарэсам і г. д. Падаецца, што наступствы падобнага жыццёвага ладу пацвярджаюць глыбокі сэнс выказвання вялікага грэчаскага драматурга Сафокла: «Не сладок плод бездельного досуга. И праздному не помогает Бог». Сацыякультурная сітуацыя, якая сфарміравалася ў дзяржаве шмат у чым дзякуючы неабмежаванай шляхецкай вольнасці, гэта выразна прадэманстравала: пашырэнне анархіі і рознагалоссяў у шляхецкім саслоўі, аслабленне палітычнай улады і дзяржавы ў цэлым.

Напрыканцы заўважым, хоць гэта і не ўваходзіць у тэму артыкула, што побач са шляхецкімі ўвесяленнямі існавалі іншыя патрэбы, аб чым сведчыць пакінутая нам спадчына: замкі, бібліятэкі, тэатры, паркі, музеі і інш. Нагадаем знакамітых рэфарматараў і прадпрымальнікаў сярод шляхецкага саслоўя – М. К. Агіньскага, М. Бутрымовіча, С. Скірмунта, І. Л. Храптовіча, П. Бжаздоўскага, Т. Рэйтана і інш. Аднак гэта тэма асобнага грунтоўнага даследавання.


1. *Гладышчук, А.* Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі: гіст.-дакум. нарыс / А. Гладышчук. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. – 288 с.

2. *Мальдзіс, А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII ст. / А. Мальдзіс. – Мінск : Лімарыус, 2001. – 384 с.

3. *Пярсідская, Ю. Д.* Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI–XVIII стст.: (мастацтвазнаўчая рэканструкцыя) : дыс. … канд. мастацтвазнаўства : 11.00.09 / Ю. Д. Пярсідская. – Мінск, 2007. – 123 арк.

4. *Шышыгіна-Патоцкая, К. Я.* Нясвіж і Радзівілы / К. Я. Шышыгіна-Патоцкая. – 3-е выд. – Мінск : Беларусь, 2007. – 240 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***И. Н. Воронович,***
*кандидат культурологии, доцент,*
*Белорусский государственный университет*
*культуры и искусств*


## ЛИЧНОСТЬ В СОВРЕМЕННЫХ ИНТЕГРАЦИОННЫХ ПРОЦЕССАХ

Одной из основных тенденций современного общества является интеграция. Последняя характеризуется взаимопроникновением, объединением структурных элементов техногенной культуры и выражается в процессах глобализации, интернационализации, мондиализации. Интеграционные процессы